**ГУРЫН Мікалай Канстанцінавіч.** Нарадзіўся 5 студзеня 1948 г. у в. Чырвоная Зорка Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Беларус. Скончыў спартыўны факультэт Беларускага інстытута фізічнай культуры па спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт" з наданнем кваліфікацыі "Выкладчык, трэнер" (1970). Служыў у Савецкай Арміі (1970–1971). Працаваў асістэнтам (1971–1973), выкладчыкам (1973–1987), старшым выкладчыкам (1987–2000) кафедры фізвыхавання БрДУ. У 2000–2013 гг. – старшы выкладчык кафедры фізічнай культуры. У 1990 г. быў намеснікам дэкана прыродазнаўчага факультэта па спартыўна-масавай рабоце. Узначальваў абласную федэрацыю па мастацкай гімнастыцы. Суддзя нацыянальнай катэгорыі. Аўтар звыш 50 навуковых, вучэбна-метадычных, навукова-папулярных публікацый.

***Асноўныя публікацыі:*** Методические указания по организации и проведению туристических походов со студентами. Брест, 1990; Методические указания по организации спортивно-массовой работы на летних полевых практиках со студентами факультета естествознания. Брест, 1990.